Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцiі i адмiнiстрацiі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай i дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фамiлiей i адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фамiлiей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамiлiя. Адрэс i фамiлiя толькi для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць i укарачываць прысланые рукапісы i аўторам назад іх не звертае.

Год X. 21 Лютаго 1915 г. № 7

## Да культурнай працы.

Цяжкіе, сумные часы даводзіцца перажыць нашай бацькоўшчыне,—той бацькоўшчыне, над катарай толькі недаўна пачалі лунаць першые зоркі адраджэньня і дзе толькі колькі год таму назад раздаўся зычны кліч да новаго, лепшаго жыцьця...

А цяпер вайна ізноў неміласэрна адарвала шмат працаўнікоў з роднаго загону.

Не адзін можэ йшчэ ня вернецца, не адна можэ ешчэ горкая сьлеза сплыве па сумнаму твару бацькі, маткі, жонкі або дзяцей...

Бедны, абездолены край.

Але ўсёж ткі не ў плачу, не ў сьлязох наша будучыня.

Годзі галасіць.

Галасілі і плакалі мы колькі сот год, пакуль не загубілі бадай усяго, што мелі.

Забыліся, хто мы, і асталіся ў паднявольным жыцьці, ў паняверцы.

Ад гэтуль толькі здзек над нашай мовай, песьняй, над душой быў чуцен на нашай жэ роднай зямельцы.

Дажылі такіх часоў, калі сыны пачалі чурацца маткі сваей—Беларусі, здзекавацца над ёй...

Калі бацькі пачалі праклінаць сыноў сваіх...

Ня дзіва, што цёмные хмары завалаклі ўсё беларускае неба, што толькі жудасьць і бязмерная трывога запанавалі ў нашых народных песьнях.

Але шлях смутку і трывогі не вядзе да жыцьця, да шчасьця: шчасьце трэба здабыць сваей працай, часта працай цэльных пакаленьнёў.

За такую працу павінен узяцца ўвесь наш народ. Толькі яна творыць моцны, трывалы фундамэнт лепшаго жыцьця.

Вайна зрабіла аграмадные шчэрбы ў нашых радох, але мы тым больш павінны рупіцца, каб замест тых, што цяпер гібеюць у акопах, знайшліся новые працаўнікі, каторые, злучэные моцнай верай у сьветлую будучыню, выйдуць на вялікую грамадзкую работу. Да гэтаго цяпер трэба ўсіх клікаць. Нікай ніхто не астанецца глухім на гэты кліч!

Мы павінны вучыцца супольне працаваць у ўселякіх хаўрусах, таварыствах, кассах, — каб не адстаць ад іншых народоў, каб ня быць ізноў паневеранымі, каб урэшці прыйшоў такі час, што з намі будуць усе рахавацца, як павінна быць.

І хаця блізка чутны грымоты гармат, хаця чырванее неба ад нялічэных пажарышч вёсак, хаця сэрцэ с трывогай сьціскаецца, ці не забілі там нейдзе нашаго брата, сына ці бацьку, трэба спакойна рабіць сваё дзела.—Трэба браць прыклад с таго польскаго селяніна, каторы, ня гледзячы на крывавую бітву навакол яго хаты, выйшоў с сахой на поле, каб прыгатаваць свой загон пад сяўбу: ён ведаў, што калі ў пару не пасее, дык і плёну ня будзе мець, як настане спакой.

Тое самае і у нас.

Калі не прыгатуем на час сваей зямелькі, — вайна пройдзе, як праходзілі ўсе вайны, а мы ня будзем меці што зьбіраць...

**Янка Окліч.**



† Юзюк Пашкевіч.

## ПАМЯЦІ ЮЗЮКА ПАШКЕВІЧА.

Ешчэ адна ахвяра вайны—а колькі іх усяго?!.

**„Юзюк Пашкевіч—падпаручык . . . . палка—10/II 1915 году аддаў душу, баронючы Гродно“...**

Гэткі кароткі напіс зроблен на магілцы добра вядомаго віленскім беларусам падпар. Пашкевіча, пахаванаго да часу у Гродні.

Неяк не шанцавала яму ад самаго пачатку вайны.

28 жніўня яго ранілі у Прусіі: прастрэлены былі рука і нага, контужэна галава.

Лячыць павязьлі ў родны горад — Вільню, дзе поў жыцьця пражыў.

Не пасьпеў зусім паправіцца, вярнуць сілы,—а 18 лістапада ізноў паехаў на пазыціі.

28-го сьнежня пісаў аттуль:

«Як толькі прыехаў, то зара атрымаў роту і ўжо ею камандую трэці месяц.

«Людзі мае вельмі добрые і любяць мяне, бо як пачулі, што мяне хочуць перэвясьці у другую роту, то прасілі не пакідаць іх... Яны знаюць, што за іх плечы не схаваюся, як будзець туга, і кажду́ю мінуту могуць забіць...»

Бытцым напрарочыў сабе...

10-го лютаго—ужо будучы пад Гроднам—загадалі Пашкевічу вясьці роту ў атаку. Пайшоў сам наперадзі.

Ішлі па голым полі. Разам затрашчэлі кулемёты, засыпалі ўсіх градам куль.

Прастрэляны у трох мейсцох—у грудзі і ў жывот, падпаручык Пашкевіч упаў на зямлю першы. І ўжо болей не устаў.

Салдаты пахавалі яго недалёка ад таго мейсца, дзе ён душу аддаў. Тры дні на тым полі ішоў бой, тры дні лілася йшчэ кроў...

Дайшла сумная вестка да Вільні. Тутака лечыцца брат нябошчыка — капітан Вацюк Пашкевіч, жыве сестра яго—сестра міласэрдзя ў заразным бараку. Яны у двох с прыяцелем забітаго паехалі у Гродно—шукаць цела.

Знайшлі скора: салдаты с сьлязмі ў вачах вялі іх і выкапывалі з магілы забітаго свайго камандзіра, каторы паказаў, што папраўдзі ніколі за іх плечы не хаваўся, заўсёды быў пры іх, думаў аб іх.

А пад той час за чверць вярсты — бытцым страшэнная музыка—грымелі гарматы, разрываліся шрапнэлі...

Цела пакуль-што пахавалі у Гродні—ля капліцы. Пасьля павязуць у Лідзкі павет, дзе Пашкевіч радзіўся, дзе йшчэ цяпер жывуць бацькі яго старэнькіе.

А яго гэтак заўсёды цягнула да сябе родна зямліца. Заўсёды думаў, што пасьля вайны пакіне службу і сядзе на родны загон—між сваім народам, каторы гэтак любіў.

Юзюк Пашкевіч заўсёды быў шчырым беларусам, ад роднай мовы не адрэкаўся. Заўсёды гаварыў ёй, пісьмы пісаў па беларуску.

Тут, у Вільні, бываў усюды, дзе зьбіраліся беларусы. Між імі чуў сябе найлепей.

У роднай старонцы сьмерць яго спаткала. На сваей зямлі косьці злажыў.

Не судзіла яму доля прыждаць лепшых часоў, ясьнейшай будучыны Беларусі, ў каторую шчыра верыў.

Хай-жэ будзе яму лёгкай гэта зямліца родная, мілаваная!..

**а—н—а.**

---

# ВАЙНА.

Тады, калі ўжо каторы месяц змаганьне паміж хаўрусьнікамі і немцамі на Заходнім (француском) фронце змянілося якбы у самаабарону кожнай з ваюючых старон—абодвы праціўнікі якбы застылі на адным мейсцы,—тутака-ж—на Ўсходнім (расейскім) фронце бушуе неспыняючыся крывавая барацьба на жыцьцё і сьмерць і, як раз'юшэные хвалі ўзбунтованаго мора, перакідываецца з аднаго ў другі район поля бітваў, нясучы с сабою дым пажароў і ручаі гарачай чэлавечай крыві. Ад Балційскаго мора і чуць не да самаго Чорнаго мора напіраюць ня дрэмючы два заўзятые і вялікіе праціўнікі: расейцы і аўстро-немцы. І вось на гэтай колькісотвёрстнай даўжыні фронту ваенных змаганьняў мы і бачым безупыннае напіраньне ваюючых сіл то у адным мейсцы, то ў другім. Мы бачым, што чуць толькі прыціхла крыху крывапраліўная барацьба на левым беразі Віслы, як у той-жэ момэнт перэкулілася фаля змаганьняў у район праваго берагу Віслы аж да Нёману. Поруч з гэтым у другім канцы гэтаго Усходняго фронту — у Галіччыні каторы ўжо тыдзень ідуць крывавые, бітвы як можэ нідзе і ніколі! Тутака аўстро-немцы, каб спыніць расейскае наступаньне у Вэнгрыю, зграмадзілі не малые сілы і цяперака з гэтымі сіламі напіраюць на расейскую армію са стараны Карпат і Буковіны. Але апошніе весткі Штабу даюць думаць, што палажэньне расейскай арміі ня кепскае.

*На левым беразі Віслы* 11 лютаго немцы наступалі у районі ф. Могелы, але былі расейцамі адбіты. 12 лютаго расейцы адбілі нямецкую атаку ў районі Божымова і ўтрымаліся ў ф. Могелах. Далей—палажэньне без перамен.

*У Галіччыні* за гэты тыдзень крывапраліўные бітвы не спыняліся, асабліва ў Галіччыні Ўсходней. 11 лютаго заўзятые бітвы адбываліся каля рэкі Чэчвы. 12 лютаго ў районі Рознатова расейцы адбілі 4 атакі аўстрыякоў. У Заходней Галіччыні, ў районі Закліча, расейцы адбілі заўзятые паўторные атакі аўстрыякоў, падтрымліваные сільным гарматнім агнём. 13 лютаго ў районі Рознатова расейцы адбілі заўзятые атакі аўстрыякоў. 14 лютаго у Усходней Галіччыне расейскае войска, рушыўшыся з даліны Чэчвы на фронт Ясіновец—Рознатов, нанесла аўстрыякам вялікіе страты. Наступленьне вялося цераз густы лес, дзеле чаго расейскіе полкі павінны былі прабіваць сабе дарогу штыхамі і прыкладамі (кольбамі) без падмогі артылеры. 15 лютаго у Усходней Галіччыне праціўнік перайшоў к абароне у районі Езуполь. 16 лютаго наступленьне аўстрыякоў у Усходнюю Галіччыну спынено. На шляхах ад Галіча к Station... 

Станіславову аўстрыякі панесьлі значную паражку, пасьля каторай абзначыўся іх атход. 17 лютаго у Усходней Галіччыні аўстрыякі, бараніўшые перэправу цераз Ломніцу, мелі новую немалую неўдачу. Расейскае войска, перайшоўшы з боем цераз гэту рэку, заняло вёску Красна. У *Карпатах*, у районі паміж рэкамі Ондава і Санам, 15, 16 і 17 лютаго дзень і ноч аўстрыякі кідаюцца у страшэнна заўзятые атакі на расейцоў, каторые расейскае войска карысна адбівае. Бітвы тут даходзюць да рукапашных схватак. Страты у гэтых бітвах праціўнік нясе страшэнна вялікіе. У *Буковіні* 15 лютаго расейцы занялі Садагуру. Як заўсёды, у бітвах у Галіччыні расейцы захопліваюць шмат палонных.

**На Каўказкім фронце** расейцы пасовываюцца наперад ў *Зачорохскім* краю. Проба турак перайці тут 16 лютаго у проці-атаку расейцамі адбіта з вялікімі для турок стратамі. 16 лютаго расейцы мелі карысные стычкі у Ольцінскім напрамку. 15 лютаго расейскае войска ў прыморскім районі захапіло з бою важны для туркоў ў ваенным дзелі порт Хопа.

**На Заходнім фронце** нічога важнаго.

**Абстрэліваньне Дарданэляў** хаўруснымі параходамі з мора не спыняецца. Ужо зруйнована колькі прыбярэжных турэцкіх укрпленьняў. Для хаўрусьнікоў (французоў і англічаноў) важна тое, каб, знiстожыўшы прыбярэжные укрпленьні, с каторых гарматамі туркі абстрэліваюць хаўрусные параходы, і валавіўшы падводные міны,—мець магчымасцьць свабодна пераплысьці цераз гэты Дарданэльскі праліў з Эгейскаго мора у Мраморнае. А там ужо без ніякаго страху можна падплысьці і пад самы Константынополь.

## На вайне і каля вайны.

**Мінные і агневые апараты.** У апошніе часы выявілося, што нямецкая армія вельмі карыстаець з мінных апаратоў і ручных гранатоў, а ў недаўніх атаках яшчэ і з агневых апаратоў. Мінные апараты найболей падобны да тых, якіе робюцца для уваружэньня крэпасных фортоў. Гэтые апараты кідаюць цудовы набой на далечыню, каля 300 сажняў. Агневые апараты выкідываюць полымя запаленай алівы, пры гэтым агневы язык даходзіць да трох сажняў даўжыні.

**Падробнасьці бітваў на Бзуры і Равцы.** Як паказвае нямецкае паведамленьне, Вільгэльм сам знаходзіўся у часе вялікіх бітвоў на Бзуры і Равцы. Нямецкае паведамленьне пацьверджае над'звычайна вялікае значэньне гэтых бітвоў, якіе па велічыне і заўзятасьці змаганьня выказанаго з абедзьвох старон, можна прыраўняць да самых важных гістарычных бітвоў, і лічыць іх такімі самымі, як Бородзінская бітва. Біліся без перэстанку дзень і ўсю ноч. Нямецкіе густые калонны рабілі шалёные атакі на расейскіе пазыцыі, адважна абараняные расейскім войскам. Поле бітвы засеяно трупамі нямецкаго войска. У некаторых мейсцох горы трупоў вышнёю у сажэнь. У ваколіцы, дзе адбываліся бітвы, былі сьцягнуты 10 нямецкіх корпусоў. Сотні гармат безупынна бухалі страшэнным агнём.

## З вайны.

*(Ад нашаго карэспандэнта).*

Неяк, седзючы у акопах, зайшла гутарка аб «Нашай Ніве». Вось адзін с таварышоў маіх і кажэ: «даўно, яшчэ прад вайной закрылі яе». Пачуў гэта я ды кажу: «не, хлопцы, не праўда, а вось каб дарэмна часу не траціць на гутарку, дык наце, пачытайце!» і даў ім першы нумэр «Нашай Нівы» з гэтаго году. — «Дык вось як! яшчэ жыве»,—атказаў хтосьці каля мяне. —«Жыве, — кажу я,—і будзе жыць!»

Пачалі мы усе гуртам чытаць далёка ад бацькоўшчыны родные словы і пабачылі мы ўсе, што «Наша Ніва» яшчэ жыве, клічэ і будзіць ад сну бацькоўшчыну...

Так, браток, жыве і будзе жыць! Будзе жыць, пакуль мы жывём, і чэкае там нас, новых працоўнікоу, чэкае...

І мы прыдзем...

Гэй! ці чуеш? Грымяць ворагоў раскаты ізноў... грымяць і адгалоскам далёкім трасуць бацькоўшчыну маці і гулка будзюць... завуць да працы!.

Угледайся ж, браток! сьцеражыся кулі. Яшчэ нам трэба жыць!.. Ці чуіш?... У сьвісьце куль, шрапнэляў і гранат, даўно забытые магілы і словы працоўнікоў адбіваюцца... Гэй, вы там! ці жывы ў далёкай поўначы? Ці чуіце?.. Недалёкі той час!... Мы прыдзем да вас.

Рвуцца шрапнэлі, сьпеваюць пулі, і чую я ў песьні сьмерці хтось стогне...

Мы прыдзем, мы прыдзем...

Прыглядаюся я... дым заслаў мне вочы, кругам агонь, рвецца і стогне зямля...

Гэй, браток, сьцеражыся!.

**В. А.**

## Вечар.

Мой вечар, знаю, блізка, недалёка—
Ёсьць раніца—павінны й вечар быць,
Але ня счэзну я с-пад долі вока—
Дзень, вечар, ноч, а трэба, буду жыць!

Зямлі і сонцу нізка пакланюся —
Я сын зямлі і сонца вольны сын
Як з братам, з ветрам шчыра абыймуся—
Я — ветру, а мне вецер друг адзін!

Сум вечны пасаджу свой на пасадзе—
Ен заслужыў даўно ў мяне на трон.
Ўзлажу карону с сьлёз яму ў парадзе—
Така карона ўсіх важней карон!

Слугой яму прызначу адзіноту—
Яна сама вярнейша с слуг,—без здрад;
Асьветлю хорам сваіх дум яснотай—
Дум шмат я маю, ах, як шмат, як шмат!

Душы дам волю, заручуся с песьняй—
Душа і песьня—сьвет мой, скарбы ўсе мае...
Хай раніца жыцьця майго ускрэсьне,
Хай вечар мне жыцьця ноч дапяе!

4/II—15 г. **Янка Купала.**

* * *

Я хацеў-бы спаткацца з Вамі на вуліцы
У ціхую сінюю ноч
І сказаць:

# РАБАЯ СУЧЭЧКА.

*(Простая гісторыйка з філязофічнымі талкаваньнямі на кожным кроку).*

### I. Ўступ с перцам.

Рабая сучэчка... Але толькі не лайся, шаноўны чытач, за гэткае нецікавае названьне! — перш добра памазгуй над гэтым, а пасьля ўжо воля твая! У жыцьці челавека самые нецікавые драбніцы йграюць вялікую роль. Болей гэтаго — перэкручываюць ўсё жыцьцё да гары нагамі, як добры гаспадар свой новы кажух на дажджу. Болей гэтаго—само жыцьцё, усё аграмаднае жыцьцё, збудавано з драбніц, як вялікі мур з маленькіх цэглін. Болей гэтаго—німа такой рэчы на сьвеці, хоць-бы самая наймалейшая і нікчэмная на від, аб каторай ня можна было-бы казаць: «варта падумаць!» Ўзяць напрыклад гэткую штуку: Ньютон, ўгледзіўшы у садзе, як яблычка упало з дрэва, зараз-жэ дабраўся да вялікай сыстэмы сваей: «цягоценьне цел».

Ўзяць напрыклад хоць-бы... хоць-бы... але хай будзе досіць на гэты раз, бо зраблюся лысым без часу ад гэткай філязофіі... А ты ведаеш, што я лысых страшэнна пужаюся. Мне здаецца, што лысы—гэта ня лысы, а голы чэрэп. А голы чэрэп — гэта кожнае дзіця ведае, азначае сьмерць. А сьмерць ведаеш чым пахнець?..

Значыць пачынаю!

### II. Пачатак, як ўсе пачаткі.

Была у Мацея Лабача рабая сучэчка. Ты напэўна падумаеш, што яна, як ўсе рабые сучэчкі на сьвеці, дык я табе шчыра скажу, што не—для Мацея не такая, як ўсе. А чаму, ён і сам добра ня ведаў, толькі душой ён гэта чуў.

Самае ліха і самая важная штука была ў тым, што для рабенькай сучэчкі было салодка тое, што ня можна. Тая рэч, каторая для ўсіх была горэй, чым «ня можэ быць», ёй было патрэбна. Яна гэта цьвёрда дамагалася пад ўласнай дыхтоўкай: «Я хачу!»

Грэх—заўсёды вельмі салодкая і цікавая штука. Цягу да грэха маюць усе стварэньні на зямлі, толькі гэта цяга, якбы разбаўлена вадой другімі інстынктамі характэру. А ў сучэчкі рабой гэты грэх быў проста «мэтай жыцьця».

Ад гэтай самай «мэты жыцьця» рабой сучэчкі болей ад усяго сыпаліся цьвёрдые шышкі на галаву Мацея Лабача. Мацей Лабач быў чэлавек вельмі лагодны і супакойны, с таго фасону людзей, каторым паўнюткую шклянку вады пастаў на галаву, а яны і кропэлькі не пральюць. Мажліва, што дзеля гэтакіх праціўнасьцей у характэрах і зрабілася зьвязь у іх—гэта значыць у Мацея с сучэчкай, бо саўсёды так бывае.

### III. Іх нецікавае знаёмства і цікавае, што вышло з гэтаго.

Прылучылася, яна знакам тым, рабая сучэчка да Мацея неяк раз у мястэчку на кірмашы, калі ён хадзіў па вуліцы ды варон стрэляў, як гэта гаворыцца.

С таго часу яна якбы прырасла да яго. Калі часам у ваколіцы бачылі дзе сучэчку, дык ведалі, што і Мацей тут блізка; калі бачылі дзе Мацея, ведалі, што і сучэчка тут блізка. І зараз-жэ рабіліся аблавы і сыпаліся паганые лаянкі з усіх бакоў, бо Мацеева сучэчка улаўчылася спягнуць дзе акраец хлеба са стала, дзе жбан малака перэвярнула, дзе сала цяпнула. Прабавала яна часамі і курэй душыць.

— А каб яе ваўкі зарэзалі з гаспадаром разам! — лаяліся людзі, пакрыўджэные ёю.

— Суседзі мае, то-ж — бы—то, што я тут не вінават,—прасіўся, маліўся бедны Мацей,—яна ў мяне ў хаце ня меней шкодзіць, але прывязалася, як тая смала, і радачкі німа! То-ж-бы-то, што нейкі дух нячысты у ёй сядзіць!.. Часта бывалі гэткіе паганые гісторы.

Ўсё-ж такі зжыліся яны, прывыклі адзін да аднаго німа ведама за што...

### IV. Самае сьмешнае і самае трагічнае.

Ад вёскі да мястэчка—былі тры карчмы па дарозі і, як вядома, што карчмы ніколі не мінаюць, то і наш Мацей строга гэтаго прытрымліваўся. Сучэчка гэта ўжо добра ўцяміла і заўсёды забегала наперад і чэкала гаспадара ля дзьвярэй. Тамака, убачыўшы сучэчку, ўжо ўсе казалі, што Мацей Лабач скора прыйдзе.

Ведаючы усюды слабасьці рабенькай, дык ужо у хату яе не пускалі ні за што. А колькі прыкрасьцяў меў бедны Мацей праз гэта, колькі наганяю ад жонкі, дык толькі ой-ой-ой!

«Бачыце гэтые буйные зоркі,
Ясные зоркі Гэркулеса?
Да іх ляціць нашэ сонцэ
І нясецца за сонцэм земля.
Хто мы такіе?
Толькі падарожные, — папутнікі
сярод нябёс.
На што-ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горэч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?

**Максім Богдановіч.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Конфіскацію**, наложэную дачэсным Цэнзурным Камітэтам у Вільні на № 2-гі «Нашай Нівы» с сёлетняго году, Віленскі Акружны суд зацьвярдзіў. Рэдактар І. Луцэвіч будзе атказываць на судзе па 3-му пункту 1034[4] стацьці.

**Абавязываючай пастановай** забараняецца скупліваць у граніцах віленскай губэрні і вывозіць з яе без асабліваго пазваленьня медзі ў сырым відзе, ўселякіх выробоў з медзі, мосяжу і бронзы, а такжэ медзянай манэты і ўселякіе кускі і брак з названых мэталоў. Усе і кожны, каму будзе ведама аб скупліваньні і вывожэньні названых рэчэй, гэтым абавязываюцца зараз-жэ заяўляць аб гэтым мейсцовай паліціі. Вінаватые у невыпаўненьні гэтай абавязываючай пастановы будуць карацца або штрафам да 3 000 руб., або турмой ці крэпасьцяй да 3-х месяцоў.

**На чыгунках.** «Н. К.» паведамляе, што прадажа пасажырскіх білетоў і прыйманьне багажа вялікай і малой скорасьці, па загаду с Петраграду, прыпынены на станціях ад Кошэдар да Вежболова і на ўсе станціі занёманскаго району ад Оран і Гродна ца Сувалак. Ад Кошэдар да Коўны пасажыры могуць ехаць толькі па асаблівым пасьведчаньні камэнданта Ковенскай крэпасьці, і то толькі па сілі магчымасьці.

**Дастаўка раненых.** За апошніе дні у Вільню дастаўляюць массу раненых. З гэтай прычыны асвабоджэные раней госпіталі пачынаюць ізноў напаўняцца раненымі салдатамі.

**Павялічэньне „пайка“.** Віленскае губэрскае прысуства павялічыло на 40 кап. штомесячны паёк для ўзрослых і дзяцей старэйшых за 5 год для сем'яў салдатоў, пакліканых на вайну, так што цяпер будуць атрымліваць у месяц па 3 р. 56 к. на душу.

**Гаспадарка і вайна.** У Вільні даецца ў знакі недастача пошыру. Селяне не падвозюць сена і саломы. Спыніліся такжэ дастаўка пошыру і па чыгунцы. Цэны на сена і салому павялічыліся амаль ня ў двое.

Цяперака с тых ці іншых прычын аддаецца у арэнду шмат двароў і фольваркоў. Дзеля гэтаго аддаюцца двары у арэнду па зменьшанай цане уцекачом с Польшчы.

**Патайные браваркі.** За апошняе паўгоду выкрыта у віленскай губэрні 58 патайных броваркоў, тады калі праз цэлы 1913 год выкрыта іх на тым самым абшары толькі 15.

**Забароненая дзіч.** С прычыны, што скончыўся тэрмін, калі можна палеваць (ахоціцца) на зайцоў і курапатак, цяперака гэту дзіч адбірае на віленскіх рынках гарадзкая паліція

**Пажар.** Надовічы у фальв. Баброўшчыне, дзісненск. пав., прозороўскай вол., згарэў млын і тартак, што належылі да Косова. Шкоды 16,000 р., ня лічучы згарэўшых будынкоў, каторые не былі застрахованы.

**Кара сьмерцяй.** Віленскі ваенна-акружны суд засудзіў нямецкаго колоніста (пасяленца) В., за збройны напад і грабежство у двярэ Таўрогі, у часе, калі гаспадар быў забраны немцамі за заложніка на кару сьмерцяй цераз пavешэньне.

## З Міншчыны.

**Замыслоўскі**, вядомы віленскі дэпутат у Думе, як даведываецца «Рѣчь», прыдбаў сабе дэпутацкі цэнз у мінскім павеці. Мінскіе правые расейцы якобы маняцца выставіць яго кандыдатам у V-ю Дзержаўную Думу.

**Нямецкая земля.** «Kur. Lit.» у карэспандэнціі з Мінска паведамляе, што мінскіе правые расейцы пастанавілі старацца, каб земля, каторая па новаму праву будзе забрана ад немцоў у Беларусі, Літве, Украіне і Польшчы, была аддадзена для тых салдатоў непрыгодных да працы, каторые вернуцца з вайны.

**Мінская „каланча“.** Як ужо пісалося у «Нашай Ніве», княгіня М. Радзіваліха хочэ адкупіць ад гораду каланчу з зямлёю дзеля устройства там дзіцячай бальніцы і касьцёла. Горад згадзіўся прадаць гэта княгіні за 350,000 руб. Але губэрскае прысуства з гэтай прадажай не згадзілося і пастанавіло перэдаць пастанову мінскай думы у міністэрство, каб яно гэтай пастановы не зацьвярдзіло.

**Сьмерць ад «дэнатуркі».** У Баранавічах памёрла ад выпітаго дэнатурованаго спірту (непрыгоднаго для піцьця) селянка А. Тарасюк.

**Пажар.** У двярэ Вулькі, пінск. пав. згарэў панскі дом. Шкоды 6,000 руб.

**Яшчэ аднэй меней.** На ст. Негорэлое Александр. чыгункі закрыта на заўсёды «казённая вінная лавка».

**За зямлю.** (Ад нашэго карэспандэнта з Жортай, барысоўск. пав.), Абыватэль барысоўскаго павету Керсноўскі апісаў свайму гадаванцу Антончыку валоку зямлі у Разлогах, красналуцкай воласьці. Як па сьмерці старого Керсноўскаго, яго сын прадаваў Разлогі шляхціцу-каталіку Ж., то і Антончык сваю валоку прадаў таму-ж Ж.

Праз гадоў чатыры Антончык, як праваслаўны, дайшоўшы, што каталік не мае права купляць у его землі, гвалтам усадзіў сваю сям'ю у хату к Ж. і адабраў сваю валоку, не звернуўшы 600 руб., атрыманых ім за зямлю. Пайшлі суды, каторые цягнуліся ўжо тры гады і дайшлі да таго, што 7 гэтаго лютаго, як Антончык вёз адкулісь-то бульбу, жонка Ж. выскачыла і трэма кулямі з рэвольвэра у грудзі, полажыла Антончыка на мейсцы трупам.

*Каганец.*

---

**На змаганьня с пошэсьцяй.** У Дзьвінску, Вітэбск. губ., дума пастанавіла старацца перэд урадам аб выдачы безпрацэнтнай пажычкі ў 50,000 руб. на выпадак змаганьня з заразнымі хваробамі.

**Павялічэньне «пайка».** У Вітэбску с прычыны дарагоўлі горад стараецца аб павялічэньні выдаванаго сем'ям пакліканых на вайну казённаго пайка (запамогі) с 3-х руб. 25 кап. да 4-х руб. у месяц на душу.

**Уцекачы** У Вітэбск прыбыло 900 уцекачоў з мейсцоў захопленых вайною. Надзеляе уцекачоў ядой пакуль што харчэўны пункт на вакзалі.

**Сабачая доля.** У Нэвелі, вітэбскай губ., с публічнаго торгу (з ліцытаціі) прададзены некійсьці заблудзіўшыйся сабака. З ім немала мелі клопату бацькі гораду пакуль не прадалі за 69 кап.

**Абавязываючай пастановай** камэнданта Гродзенскай крэпасьці забараняецца жыхарам Гродны выходзіць на вуліцу пасьля 9 гадзіны веч., а магазыны і крамы павінны закрырацца да 9 г. веч. Вінаватые ў невыпаўненьні гэтаго будуць карацца да 3000 р. штрафу, або да 3-х месяцоў арышту ў турме.

**Таргоўля у Гродні.** Па загаду камэнданта Гродзенскай крэпасьці паліцмэйстэр абвесьціў па гораду, што ўсе гандляры жыды павінны таргаваць уселякімі таварамі павэдлуг звычайнаго парадку у пятніцу і суботу, і не закрываць магазыноў да 9-й гадзіны вечэра. Вінаватые ў невыпаўненьні гэтаго крамнікі будуць строга карацца.

# З усіх старон.

**Суд над дэпутатамі Дзержаўнай Думы і інш.** 13 лютаго Петраградзкая судовая палата засудзіла члероў Дзержаўнай Думы Петровскаго, Муранова, Бадаева, Шагова і Самойлова, дваран Розэнфэльда і Яковлева, селян Ліндэ і Вороніна на пазбаўленьне усіх правоў і ссылцэ на пасяленьне, Анціпова на арышт у крэпасьці на 8 месяцоў і Гаврылову — на поўтары гады, абоім з залічкай атседкі да суду. Падсудзімы Козлов апраўданы. Усе яны судзіліся за прыналежнасьць к соціалдэмократычнай парціі і ўстройство недазволенай сходкі, на кватэры Гаврыловай у Петраградзі.

**Забарона вывазіць запасы харчоў.** «Бирж. Вѣд.» паведамляюць, што ў скорым часе будзе забаронена вывозіць харчэўные прадукты і корм для жывёлы з межаў расейскай дзержавы.

**На змаганьне с пошэсьцяй.** Рада міністроў атпусьціла 1,200,000 руб. на змаганьне с халерай і чумой ў надходзячую вясну. Палавіна гэтых грошы аддаецца на рукі гарадзкіх і земскіх самаупраўленьняў.

**Аб прызыве запасных і ратнікоў з-за граніцы.** Ваеннае міністэрство скасавало дадзеную на пачатку вайны льготу, па якой запасные і ратнікі, захопленые вайной за граніцай, маглі не яўляцца к мобілізаціі. Цяперака, як і тые запасные і ратнікі, што пры

---

«Хай таго вала чэрві з'ядуць, катораго каровы бадуць»,—кажуць людзі, але што да Мацея, дык я гэта не скажу, бо шкада чэлавека...

— То-ж-бы-то, жонка у мяне заядлая!— жаліўся блізкім сябрам сваім Мацей, — яна у мяне у нагавіцах ходзіць.

І праўда, яна была баба строгая, высокая, таўстая; Мацей проціў яе быў як камар проці вала ўсё роўна.

Ну і дзёўбала яна яго часта-густа качаргой, або вілачнікам.

Раней, калі сучкі яшчэ не было, дык ён, бывало, схаваецца у карчму ад жонкі ды нічагусенькі — выходзіў сухі ад яе лупцовак. Але цяпер, то ўжо немагчыма было гэтакім спосамам выкруціцца ад Мацеіхі: сучэчка, як праўдзівы вартаўнік, лежала заўсёды пры дзьвярох, чэкаючы гаспадара, жонка убачыўшы яе пры дзьвярох, дагадывалася, што Мацей тут, і па свайму з Мацеям разлічывалася.

Праўда, ён часта пасьля гэткаго рахунку спаганяў злосьць на сучачцы. Але яна ужо болей меней ўцяміла гэтую штуку і ў такіх крытычных мамэнтах трымалася ад яго надалечыні на целы выстрэл каменя.

— То-ж-бы-то! сучэчка мяне у магілу угоніць без часу!—жаліўся ён суседзям.

— Дурэнь ты, павесіць яе трэба! — раілі яму усе.

— То-ж-бы-то, павесіць! — лёгка вам казаць, а баба тады мяне жывога з'есьць, бо яна за сучэчку вочы дзярэ...

Людзі сьмеяліся, а Мацей чухаў патыліцу.

**V. Болей сьветлые і прызные хвіліны у іх супольным жыцьці.**

Гэтак час ішоў.

Сучэчка падбліжыцца да Мацея асьцерэгалася, але з віду яго не выпускала ніколі. Часамі у добрую часіну, калі ў Мацея за пазухай грэў грудзі шкалік манапалькі і яму было «морэ па калена», ён клікаў сучэчку бліжэй да сябе.

— Гэй, сучка, то-ж-бы-то, на, цю, на, цю, на!—і кідаў ёй кусок закускі. Яна тады атчувала цеплату душы яго і сьмела падскаківала да яго. Ён яе лашчыў, гладзіў рукой, а яна, у знак уздаволенасьці, віляла хвастом.

Вачамі яны любілі утаропіцца адно у аднаго, якбы ўжо вельмі нешта цікаваго і новаго знаходзілі тады у асобах сваіх.

Са смагай, да безпамяці чыталі яны душы адзін аднаго, як у атчыненых кнігах...

Ой, вы, душаведы! вельмі цікавая вы армія... Нават небаспечная, нехай вас не знаць!

Часамі нажом ядавітым гэтак балючэ ўрэзаецеся ў самые сьвятые сьвятых душы, што ажна горка робіцца, горка ад гэтай праўды, каторую за чуб на верх выцягіваеце... Як цётка добрая у гасьцёх, любіце ўсюды капацца, вобыскі рабіць, нюхаць і крытыкаваць. Ой, вы, душаведы!

Труціце вы вашым сьмехам заядлаго сарказму... А калі маўчыцё, то яшчэ горэй, бо ніхто ня ведае вашаго прыгавору, кожын меціць і так і гэтак, «або рыбка, або піпка», а вы тымчасам бяз літасьці у зубах сваіх трымаеця нешчасных ахвяр...

**На гэткі самы лад былі і справы у Мацея і сучэчкі.** Адно у аднаго знаходзілі яны багатые скарбы для супольнай шліфоўкі ўласных розумоў і у канцы даходзілі заўсёды да таго, як калісьці адзін вялікі філёзаф, каторы, пасьля доўгалетняй працы сваей у царстве розуму, у канцы толькі даведаўся, што н і ч о г а н е в е д а е...

Калі Мацей і сучэчка прыходзілі пасьля сваіх мазгавых практык да гэтаго самаго перэконаньня, то абое салавелі і пачыналі займацца, каб абяліць сумленьне, іншай работай: ён чухаў патыліцу, па прывычцы сваей, а яна лавіла мух, да чаго была вялікая ахвотніца.

**VI Трагэдыя над трагэдыяй.**

«Да ўсяго чэлавек прывыкае» — кажуць людзі. Гэта сьвятая праўда. Але бываюць у жыцьці гэткіе мамэнты, што самая вядомая і святая праўда выходзіць непраўдай... Аксамітные лапкі гэтак б'юць чэлавека па лабаціне, аж шышкі выскаківаюць; чэлавек аглушаецца і робіцца «ні бэ, ні мэ...» Гэтак было і тут. Здаецца увесь час Мацей праз пальцы пазіраў на ўсе праявы сучэчкі. Ён досіць прывык да розных яе выкрутасоў, каторые прыкра ат'зываліся на яго ўласнай асобе; проста лічыў ён, што у кнізе долі людзкой гэтак ужо упісана агнёвымі літэрамі...

— То-ж-бы-то! гэтак трэба! думаў ён часта.

**Змітрок Бядуля.**

(Канец будзе).

клікаліся у армію раней ад пачатку вайны, так і тые, што будуць пакліканы у будучыне, павінны на прызыў з'явіцца. Зваляюцца ад гэтаго толькі тые, што да 1 марца будуць лічыцца на службе у войску хаўрусных з Расеяй дзержавоў.

**На лазьні.** Усерасейскі хаўрус земствоў атпусьціў на ўстройство на пярэдніх пазыціях лазьняў 400.000 руб.

**За японскую вайну.** Шмат яшчэ якіе с сем'яў і удоваў па забітых у японскую вайну сваіх сем'янінах не атрымалі належачай ім ад казны штомесячнай запамогі (пэнсіону). Цяперака дадзена права, каб казённые палаты калі звернуцца да іх такіе асобы, сваей уласьцю выдавалі ім належны пэнсіон за тэрмін не даўжэйшы, як 10 год, і с такім варункам, каб агульная сума прызначэнаго пэнсіону за 10 год не перавышала 600 руб.

Сэнат выясьніў, што салдаты, увольненые з войска ад пачатку ваўны з Японіей да 1 студня 1913 г. і пазбаўленые магчымасьці працаваць, карыстаюць с права апекі над імі, не залежна ад таго ці яны увольнены ат ваеннай службы на заўсёды, ці былі залічэны ў запас або ў ратнікі.

**Для дзяцей ваякоў.** Гасудар Імпэратар Найвышэй загадаў, каб кожнаму з дзяцей салдатоў, забітых на вайне або калек і не маючых с чаго жыць, выплачываць штогод, аж да 16-го году жыцьця, па 24 р., калі жывуць на вёсцы, і ад 30 да 32 р., калі жывуць у вялікіх гарадох. Для круглых сіротоў запамога гэта звялічываецца. Апрача гэтаго усе дзеці, што ходзюць у школы, атрымліваюць за адным разам грошы на цёплую адзежу, вобуў і прылады да навукі.

**Аб „пайку“.** Да губэрнатороў дадзены загад, каб яны строга слядзілі за сваечаснай выдачай жыхаром казённаго харчоўнаго пайка.

**Права няшлюбных дзяцей.** Міністэрство выясьніло, што няшлюбные дзеці, бацькоў каторых паклікана на вайну, не маюць права атрымліваць казённай запамогі, а могуць толькі карыстаць з грамадзянскай добрачыннай помачы.

**Ваенны падатак.** Рада міністроў зацьвярдзіла праект уставы аб падатку ад асоб, увольненых ад ваеннай павіннасьці. Падатак будзе зысківацца пачынаючы с 1915 г., да 43 год узросту ападаткованого 6 руб., калі даходу мае да 1000 р. у год. 25 руб. — калі да 5,000 р., 50 р.—калі да 10,000 р., 100 р.—калі да 20,000 р. і 200 р. калі вышэй, як 20,000 р.

**Аб раненых.** Чырвоны Крыж с практыкі прыйшоў да пераконаньня, што раненые і хворые салдаты могуць лячыцца ў лазарэці ў срэднім каля 38 дзён, афіцэры каля 31 дня. Раней была устаноўлена норма толькі 10 дзён.

**Вялікодные падарункі** для арміі, павэдлуг пастановы ўласьцяў, будуць ужо прыймацца на чыгунках.

**Падданые ваюючых з Расеяй дзержавоў**, як сэнат выясьніў, пазбаўлены права судовай абароны свайго дабра.

**Забарона лекціі.** Маскоўскі губэрнатар не пазволіў прафэсару Пічету прачытаць лекціі аб славянскім пытаньні для вучыцеляў і служачых маскоўскаго павятоваго земства. З гэтай прычыны шмат слухачоў змушэны былі вярнуцца дамоў. Лекція гэта была першая с тых, якіе земство манілося уладзіць для вучыцелёў і служачых земства у часе Вялікаго посту.

**За грабежствы.** Кіеўскі акружны суд у справі аб убіўстві у 1913 г. у Кіеві арцельшчыка «Рускаго для ўнешней таргоўлі банку» і аб грабежстві 40 тысяч рублёў, трох засудзіў на катаргу ад 4 да 15 год. Некольκі супольнікоў грабежства, бараніўшыхся калі іх лавілі былі забіты.—У Новочэркаску, у справі аб нападу на параход „Пётр“, суд засудзіў: 3 падсудных на 12 год катаргі кожнаго і 4 на 8 год кожнаго. Падсудны француз ад віны звольнены.

**Кары сьмерцяй.** Адэскі ваеннаакружны суд за збройнае грабежство засудзіў трох дзяцюкоў, 21 году узростам, на кару сьмерцяй.

**Убіўство.** Каля Кіева ў вёсцы Снятынец нехта забіў вітэбскаго судавога следаваццеля Міроновіча, прыехаўшаго да свайго хвораго бацькі.

**Як будуць судзіць за „дэнатурку?“** Цяперака судовые ўласьці заканчываюць сьледствы аб усіх тых, што з дэнатурованаго спірту выраблялі напітак для піцьця. Усіх віноўных будуць судзіць, як за сумыснае атруцьцё па 1458 стацьці, каторае карае пазбаўленьнем усіх правоў і ссылкай у катаржные работы ад 8 да 15 год

**Дарагоўля у Петраградзі** вельмі даецца ў знакі. Былі дні калі за фунт чорнаго хлеба плацілі с падзякай па 10 кап. За мяса ад 11 лютаго плацюць па 27—28 к. фунт. Прычынай гэтаму хітрасьці гандляроў.

**Шчэпліваньне воспы.** С прычыны, што паявілася пошэсьць воспы, міністар асьветы загадаў, каб усім вучням і вучэніцам была прышчэплена цяпер воспа.

**Як і летась,** у Петраградзі 13 лютаго на табачнай фабрыцы бр. Шапшал былі здарэньні, што некольκі работніц раптоўна захварэлі. Рэшта работніц не захварэлі дзеле таго толькі, што ў сваім часе іх вывелі с фабрыкі. Прычыны такой агульнай хваробы яшчэ ня выясьнены.

**Аб жыдох.** Сэнат прызнаў, што дзеці жыдоў, пражываўшых у сельскіх мейцох «чэрты оседлості» да 1882 г. не маюць права займацца ў гэтых сёлах гандлям (таргоўляй). — Кіеўскае губэрскае праўленьне не пазволіло жыдомуцекачом с Польшчы прыстроіцца на жыцьцё у Кіеві.

**Весна.** 11 лютаго с Севастополю паведамляюць, што там бушуе сільны паўдзённы вецер. Незвычайна цёпла. Мігдалы і абрыкосы—ў поўным цьвеці. Кусты пакрыліся лісьцем.

**Мяцеліца** 16 лютаго паведамляюць с Харкова, што там бушуе сьнежная бура. С прычыны заносоў, поезды прыходзюць спазьніўшыся. Паласа заносоў ідзе с поўдня.

**Нешчасьце на чыгунцы.** 6 лютаго на ст. Саперная Паўночных чыгунак наскочыў поезд на поезд. На мейсцэ катастрофы вызвалі с Петраграду асобны поезд з лекарамі і работнікамі. Паравікі здрузгаталіся, 10 вагоноў разбілося. Ёсьць раненые. Судавые уласьці вядуць сьледзтво.

**Проці родных мовоў.** Сэнат выясьніў, што у законах німа таго, каб можна было гаварыць у мейсцовых мовах на сабраньнях таварыствоў дабрачынных і іншых у Прыбалційскіх губэрнях, з гэтай прычыны на такіх сабраньнях павінны карыстацца толькі з урадовай расейскай мовы. Да гэтаго часу на сабраньнях таварыствоў можна было гаварыць па латышску і эстонску.

**За газэту.** У Умані, кіеўск. губ., закрыта газэта «Отклики провинціи». Рэдактар-выдавец ён-жэ і гаспадар друкарні, Тародаш высылаецца на час вайны у томскую губ.

**Перэсяленцы.** Ад пачатку вайны да 1 лютаго пераехало у Сібір перэсяленцоў 1040, хадакоў — 34; вярнулося перэсяленцоў— 578, Хадакоў — 545.

Упраўленьне чыгункі маніцца да часу спыніць перавозку перэсяленцоў на ўсход па тэй прычыне, што ў гэтым часе рух перэсяленцоў па свайму напрамку саўпадае з дарогамі пераезду ваенна-палонных, которымі займаюцца перэсяленчэскіе пункты. Апрача таго, такая пастанова патрэбна яшчэ і дзеле таго, каб не дапусьціць мажліваго заносу і пашырэньня хвароб ад палонных.

**Высылка пастороў.** С прыбалційскаго краю высылаюцца на час вайны пасторы—Шэерман і фон-Ратцаў—першы за гутаркі, зьневажаючые расейцоў, другі—за непрыхільные адносіны к расейскай арміі

**Сьвяточные падарункі для арміі.** Павэдлуг апошняго рахунку, пачаўшы ад 20 сьнежня, выслана у у ваюючую армію 1,358 вагоноў, а ў іх 321,376 пуд. 13 фунт. падарункоў для салдатоў. Найболей выслала Масква. Вільня стаіцьпа вялічыне на трэцім мейсцы — 35,826 пуд., далей Петраград і інш.

**Ў Фінляндзіі** па загаду ваенных уласьцяў закрылі глаўны гэльсінгфорскі магазын забавак Вінтэра за тое, што выставіў у вакне нямецкі флаг.

**Ў Польшчы.** Усім варшаўскім крэдытовым установам і банкам загадано не выдаваць зложэных у іх на працэнты грошы падданым ваюючых з Расеяй дзержавоў, выежджаючым у гэтым часе за граніцу.—У Варшаві даецца ў знакі недастача папер. Мейсцовые газэты зменшылі свае размеры да чацьвёртай часьці. — За апошніе тыдні, як падраховываюць жыдоўскіе газэты, у Варшаву прыбыло болей як 30,000 жыдоў з мейсцоў захопленых вайною. Сярод прыбыўшых ёсьць шмат столетніх старцоў, шмат сьляпых, а такжэ вар'ятоў, каторые блукаліся па мястэчках без апекі. — Немцы у заваеваных імі мейсцох Польшчы паведамілі памешчыкоў, каб тые не атцягіваючы, як прыдзе весна, узяліся за сяўбу жыта і бульбы. Пры гэтым нямецкіе ўласьці паведамляюць, што збожэ і паравые севальні будуць дастаўлены для памешчыкоў з Нямеччыны.

**У Галіччыні.** З аколіц аблеганаго Перамышлю дастаўлена ў Кіеў вялікая парція галічанскіх жыдоў. Як самі дастаўленые кажуць, атсюль у глыб Расеі выселена ўжо 7,000 жыдоў. — У Львові адбываюцца цяперака досыць часта праверкі паліціей дакумэнтоў у жыхароў. Нэдовічы праверялі другоразрадные кавярні, малачарні і сталовые. С прычыны, што ў некаторых не аказалося дакумэнтоў, у паліцію даставілі каля 50 душ, дзе часьць выпушчэна а часьць даўжей прадзержана.—У Петроградзе у Ісаакіеўскім саборы прылучэна з уніі да праваслаўя 120 галічан-вучыцеляў.

# Аб усім па троху.

**Аб захаваньнюся на вайне паводле стараго Літоўскаго Статуту 1529.** (Раздзел 2 артыкул 15). «Комубы не достало будучы на войне стацей и самому ести и пити и на кони его; тогды маеть тот з вижом гетманским где ѣхати або поити або и взяти потребу живности собе и на кони, а то маеть заплатити водлуг уставы положоное. А дрова мають брати где будуть стояти, нижли домов разбирати и плотовъ жечы и ставов волочити и спускати, ани жит ни ярин не мают таптати ани травити. А если бы хто таковую шкоду учинилъ, тогды маеть гетман наш таковых в ланцуг сажати, а предся оный тую шкоду маеть оправовати и гвалтъ платити».

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**


**Прыймаецца падпіска на 1915 год на**

**„Нашу Ніву“**

**Год выдавецтва X.**

Цэна «НАШАи НІВЫ» на год с перасылкай—2 р. 50 кап.; на поўгода—1 руб. 25 кап.; на 3 месяцы—65 к.; на 1 м. 25 к. Усе гадавые і поўгадавые падпісчыкі атрымаюць дарма **„Беларускі Календар“.**

Адрэс рэдакціі: **Вільня, Віленская 29.**

Рэдактар-Выдавец **І. Луцэвіч.**

*Падпіску на „Нашу Ніву“ прыймаюць усе почты у Расеі. Падпісываючыся на почці за перасылку падпісных грошы плаціць ня трэба.*

Фирма удостоена на россійскихъ и заграничныхъ выставкахъ **болѣе 100 наградъ.**

**СѢМЕНА**

**огородныя, сельско-хозяйственныя, лѣсныя и цвѣточныя,** самаго высш. достоинства, вѣрныхъ сортовъ и съ испытанной всхожестью, предлагаетъ въ самомъ богатѣйш. выборѣ по сам. умѣренн. цѣнамъ

**Гейнрихъ Геггингеръ въ Ригѣ,**

**Сѣменная торговля (существуетъ съ 1851 г.).**

**Каталогъ** высылается безплатно, а **главный каталогъ** со многими новостями и съ болѣе 700 рисунками высылается за 30 коп., съ наложеннымъ платежемъ 50 коп.


Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.